качествами, умеет принимать решения по сложным и спорным случаям, возникающим при индексировании документов, создании лингвистических средств и иным проблемам, встречающимся в практике ведения и редактирования ЭК.

Надо отметить, что в процессе своей деятельности, решения производственных задач происходит формирование не только профессиональных, но и личностных качеств. Чтобы добиваться хороших результатов на участках индексирования документов, формирования АЗ и редактирования ЭК, сотрудникам пришлось научиться рационально организовывать свою деятельность и решать в течение рабочего времени намеченные задачи, брать на себя ответственность в принятии решений по вопросам, находящимся в их компетенции, анализировать свои достижения и ошибки, делать выводы о том, какими путями можно улучшить результаты работы.

Индексаторам и редакторам-лингвистам свойственны эффективная работоспособность, устойчивость к монотонности при выполнении некоторых производственных процессов. Профессиональная деятельность вызывает у них чувство удовлетворения. В качестве положительной мотивации они отмечают, что работа способствует расширению кругозора, развитию внимания и памяти, аналитическому мышлению, позволяет выявить в себе определенный потенциал, формирует самоуважение, осознание значимости своей работы по обработке информации, обеспечению тематического поиска для выполнения запросов пользователей в ЭК и своего личного вклада в ее выполнение.

1. *Астапович, Л. Л.* Смысловая систематизация научной информации на основе УДК в Центральной научной библиотеке НАН Беларуси / Л. Л. Астапович, О. И. Старовойтова // Библиотеки в информационном пространстве : проблемы и тенденции развития : материалы III Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 1–2 нояб. 2011 г. – Минск : Ковчег, 2011. – С. 9-12.

2. *Астапович, Л. Л.* Использование словарей электронного каталога при тематическом поиске / Л. Л. Астапович, Т. С. Ерема // Библиотеки национальных академий наук: проблемы функционирования, тенденции развития : науч.-практ. и теорет. сб. – Вып. 13. – Киев : Национальная библиотека Украины, 2016. – С. 159-166.

3. *Соколков, Е. А.* Профессиональное становление личности специалиста-гуманитария / Е. А. Соколков. – Москва : Университетская книга, 2009. – 472 с.

***Бігеза Валянціна Мінаўна***

## Практыка-арыентаваная падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў на аснове выкарыстання інтэрактыўных форм і метадаў навучання

Разглядаецца значнасць выкарыстання інтэрактыўных форм и метадаў навучання ў практыка-арыентаванай падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў.

*Ключавыя словы:* студэнты; бібліятэчныя спецыялісты; практыка-арыентаваная падрыхтоўка; інтэрактыўныя формы і метады.

***Valentina M. Biheza***

## Practice-oriented Training of Library Specialists through the Use of Interactive Forms and Methods of Learning

Discusses the importance of using interactive forms and teaching methods in preparing library specialists for practical activities.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Keywords:* students; library specialists; practice-oriented training; interactive forms and methods.

Адметнасцю развіцця адукацыйнага працэсу ў сучаснай вышэйшай школе з’яўляецца аднаўленне адукацыі на кампетэнтнаснай аснове шляхам узмацнення практычнай накіраванасці прафесійнай адукацыі пры захаванні яе фундаментальнасці [1]. У гэтым кантэксце набывае асаблівую значнасць выкарыстанне інтэрактыўных форм і метадаў навучання.

Інтэрактыўныя метады («inter» – гэта ўзаемны, «act» – дзейнічаць) – азначаюць ўзаемадзеянне, магчымасць знаходзіцца ў рэжыме гутаркі, дыялогу. У адрозненне ад актыўных метадаў, інтэрактыўныя арыентаваны на больш шырокае ўзаемадзеянне навучэнцаў не толькі з выкладчыкам, але і адзін з адным, і на дамінаванне актыўнасці студэнтаў у працэсе навучання [2].

Ключавым для разумення сутнасці інтэрактыўнага навучання з’яўляецца паняцце інтэракцыі, якое, на думку А. П. Панфілавай, уключае ўнутрыасобасную (розныя састаўляючыя асобы ўступаюць у кантакт паміж сабою) і міжасобасную («я» ўступае ў кантакт з іншымі людзьмі) камунікацыю [3, с. 23].

У сучасны момант у педагагічнай навуцы існуе шэраг вызначэнняў паняцця «інтэрактыўнае навучанне». Псіхолагамі яно разглядаецца як «навучанне, якое заснавана на псіхалогіі чалавечых узаемаадносін і ўзаемадзеянняў» (Б. Ц. Бадмаеў), даследчыкі педагогікі лічаць, што гэта навучанне, якое разумеецца як сумесны працэс пазнання, дзе веды здабываюцца ў сумеснай дзейнасці праз дыялог, палілог навучэнцаў між сабой і настаўнікам (выкладчыкам) і інш. Абагульняючы існуючыя трактоўкі, можна адзначыць, што «інтэрактыўнае навучанне» – гэта спосаб пазнання, які здзяйсняецца ў дыялогавых формах сумеснай дзейнасці навучэнцаў, дзе ўсе ўдзельнікі адукацыйнага працэсу ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, сумесна вырашаюць праблемы, ацэньваюць свае дзеянні і ўдзельнікаў.

Для дасягнення эфектыўнасці ў арганізацыі пазнавальнай дзейнасці неабходна стварыць камфортныя ўмовы навучання, пры якіх навучэнец адчуе сваю паспяховасць, грунтоўнасць, што зробіць прадуктыўным сам працэс навучання.

Інтэрактыўнае навучанне мае вялікі адукацыйны патэнцыял таму, што павышае матывацыю і далучэнне навучэнцаў у вырашэнне абмяркоўваемых праблем, што садзейнічае далейшай пошукавай актыўнасці, заахвочвае да канкрэтных дзеянняў. Акрамя таго, інтэрактыўнае навучанне фарміруе ўменне мысліць неардынарна, па-свойму бачыць праблемную сітуацыю, яе вырашэнне; развівае такія рысы, як уменне выслухаць іншы пункт гледжання, супрацоўнічаць, уступаць у партнёрскія зносіны, праяўляючы пры гэтым неабходны такт, добразычлівасць.

Пры гэтым навучальны працэс арганізаваны такім чынам, што практычна ўсе навучэнцы аказваюцца ўключанымі ў працэс пазнання. У параўнанні з традыцыйнымі формамі вядзення заняткаў, у інтэрактыўным навучанні зменьваецца ўзаемадзеянне выкладчыка і навучэнца: актыўнасць педагога саступае месца актыўнасці навучэнцаў, а задачай педагога становіцца стварэнне ўмоў для іх ініцыятывы.

На нашу думку, асаблівую важкасць набывае інтэрактыўнае навучанне пры выкладанні спецыяльных дысцыплін на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ). Змест названых дысцыплін максімальна набліжае студэнтаў да будучай прафесійнай дзейнасці і таму інавацыйнае практыка-арыентаванае навучанне ў дадзеным аспекце прадугледжвае новы якасны ўзровень адукацыі бібліятэчных спецыялістаў. Падкрэслім, што ў працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін ставіцца задача сфарміраваць не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі прафесійныя ўменні і навыкі, але і такія якасці як прафесійная адказнасць, шматварыянтнасць мыслення, здольнасць да творчага вырашэння задач, уменне працаваць у калектыве, камунікатыўныя здольнасці і навыкі прафесійных зносін.

Практыка-арыентаваны характар выкладання спецыяльных дысцыплін знаходзіць сваё адлюстраванне ва ўсё большым выкарыстанні інтэрактыўных форм правядзення заняткаў. Акрамя лекцый, семінарскіх, традыцыйных лабараторных і практычных заняткаў, усё больш выкарыстоўваюцца такія актыўныя формы, як ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі, вырашэнне вытворчых задач, навучанне ў парах, падрыхтоўка мерапрыемстваў для канкрэтных мэтавых груп карыстальнікаў, індывідуальныя заданні, арыентаваныя на стымуляванне як інтэлектуальнага, так і асобаснага станаўлення студэнтаў. Уключэнне ў вучэбную дзейнасць элементаў праблематызацыі, навуковага пошуку, разнастайных форм самастойнай работы, а таксама вывучэнне вопыту бібліятэк замежных краін шляхам параўнальнага аналізу будзе садзейнічаць дасягненню студэнамі дакладных вынікаў навучання.

Адзначым таксама, што практыка-арыентаванай падрыхтоўцы будучых бібліятэчных спецыялістаў садзейнічае праблемнае навучанне, якое дазваляе ім на аснове выкарыстання разнастайнай інфармацыі выпрацаваць свае асабістыя рашэнні адносна існуючай праблемнай сітуацыі. У значнай ступені практыка-арыентаванаму навучанню студэнтаў садзейнічае і выкарыстанне метаду «праектаў», які вырашае задачы развіцця пазнавальных навыкаў навучэнцаў, іх крытычнага мыслення, уменняў арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы.

Апынуцца ў рэальнай жыццёвай сітуацыі садзейнічае студэнтам і выкарыстанне выкладчыкамі метада «Кейса» (Case study), які прадугледжвае вырашэнне разнастайных практычных праблем на падставе комплексу ведаў, якія павінны быць засвоены для вырашэння пэўнай праблемы. Названыя інтэрактыўныя метады навучання ўздзейнічаюць на прафесіяналізацыю навучэнцаў, фарміруюць пазітыўную матывацыю ў адносінах да вучобы.

Немалаважнае значэнне ў практыка-арыентаваным навучанні студэнтаў мае міждысцыплінарная інтэграцыя, пытанні якой абмяркоўваюцца на паседжаннях метадычных камісій кафедр факультэта.

Лекцыйныя і семінарскія заняткі па спецыяльных дысцыплінах на кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ФІДК праводзяцца з улікам практыка-арыентаванай кампаненты, развіцця крэатыўнасці студэнтаў, выкарыстання тэхналогій інтэрактыўнага навучання. Напрыклад, у працэсе выкладання дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг», якая вывучаецца ўсімі студэнтамі 4 курса і 1 групай 3 курса (скарочаны тэрмін навучання) выкарыстоўваюцца педагагічныя методыкі і тэхналогіі, якія садзейнічаюць творчай актыўнасці студэнтаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных вытворчых задач. Для падрыхтоўкі студэнтаў у галіне маркетынгу бібліятэчнай справы тэхналогіі інтэрактыўнага навучання ўяўляюць асаблівую цікавасць, таму што дазваляюць у працэсе навучання (практычныя заняткі) вырашаць вытворчыя задачы, накіраваныя на перспектыўнае развіццё бібліятэк. Напрыклад, распрацоўваць і праводзіць маркетынгавыя даследаванні, неабходныя для вырашэння праблемных сітуацый у бібліятэцы, аваладаць метадамі планавання маркетынгавай дзейнасці, здзяйсняць маркетынгавую ацэнку дзейнасці бібліятэкі, устанаўліваць кошт бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў/паслуг, ствараць бізнес-план бібліятэкі, рэкламную прадукцыю і інш. Усё гэта, безумоўна, дапаможа студэнтам у будучай прафесійнай дзейнасці прымаць эфектыўныя нестандартныя рашэнні, аператыўна адаптавацца да зменлівай сітуацыі, бачыць і ацэньваць перспектывы развіцця бібліятэчнай справы і рэальныя магчымасці канкрэтнай бібліятэкі. Па названым курсе для студэнтаў праводзіцца інтэрактыўная лекцыя «Інтэрв'ю думак». Яе мэта: арганізацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэсу вывучэння тэарэтычнага зместу ў інтэрактыўным рэжыме. Пытанні да інтэрв'юіравання фармулююцца загадзя па тэме лекцыі на аснове вывучэння крыніц. Суб'ектам інтэрв'ю звычайна выступаюць студэнты, якія падрыхтавалі інфармацыю, пытанні па зададзенай тэме. Пытанні задаюцца з месца студэнтамі між сабой па чарзе з пачатку лекцыі. Адны з іх выступаюць інтэрв'юерамі, іншыя – рэспандэнтамі. Агульная падрыхтоўка студэнтаў да такой лекцыі вымагае іх уважлівага вывучэння тэмы лекцыі, бо распрацоўка пытанняў патрабуе ведання матэрыялу, у тым ліку адказаў на пытанні. Выкладчык падводзіць канчатковыя вынікі па вывучэнні і засваенні лекцыі студэнтамі. Пры гэтым заслухоўваюцца меркаванні студэнтаў-экспертаў з аўдыторыі па зместу атрыманай інфармацыі, аб'ёме разгледжанага матэрыялу, якасці зададзеных пытанняў.

Пры выкладанні курса «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг» праводзяцца семінары-дыскусіі. Заданні, якія прапануюцца студэнтам, маюць праблемны, дыскусійны характар, што прадугледжвае актыўны іх удзел у абмеркаванні, агучванне асабістых пунктаў гледжання на разглядаемую праблему. Напрыклад, у тэме семінара «Сутнасць айчынных і замежных методык ацэнкі эфектыўнасці маркетынгу, іх выкарыстання ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці» студэнты вывучаюць айчынны і замежны вопыт тэарэтычнага і практычнага асэнсавання праблем, выкарыстоўваючы разнастайныя традыцыйныя і электронныя рэсурсы. Так, пры разглядзе сутнасці айчынных, замежных методык ацэнкі эфектыўнасці маркетынгу, студэнтам неабходна правесці самастойны аналіз існуючых разнастайных метадаў, распрацаваных «Міжнародным кіраўніцтвам па вымярэнні эфектыўнасці работы бібліятэк і комплексны падыход да яе вымярэння».

На семінары-дыскусіі найбольш адэкватна рэалізуецца прынцып круглага стала. На абмеркаванне выносяцца найбольш актуальныя пытанні вывучаемай дысцыпліны і кожны студэнт мае магчымасць выказаць сваю думку. Кожны з удзельнікаў дыскусіі павінен вучыцца дакладна фармуляваць свае думкі ў выступленні, актыўна адстойваць свой пункт гледжання, аргументавана весці спрэчкі. Глыбокае засваенне ведаў на семінары дасягаецца за кошт таго, што студэнт набывае іх асабістай працай, таму лепш засвойвае.

Гульнявыя формы пры выкладанні названага курса выкарыстоўваюцца на практычных занятках пры вывучэнні методыкі выяўлення вобраза бібліятэкі. Студэнты падзяляюцца на 2 падгрупы (супрацоўнікі бібліятэкі і карыстальнікі) і, выкарыстоўваючы метад семантычнага дыферэнцыяла, вызначаюць эмацыянальныя адносіны да пэўнай бібліятэкі вышэйадзначаных груп. Пры гэтым неабходна выявіць адрозненні ў меркаваннях, а таксама дакладныя прычыны разыходжання ва ўспрыманні бібліятэкі карыстальнікамі і бібліятэкарамі, абгрунтаваць самыя высокія адзнакі і самыя нізкія, даць ім тлумачэнне, распрацаваць прапановы па паляпшэнні сітуацыі.

Абагульняючы сказанае, падкрэслім, што практыка-арыентаванае навучанне, заснаванае на выкарыстанні метадаў і тэхналогій інтэрактыўнага навучання, садзейнічае авалоданню студэнтамі зместам прафесійнай падрыхтоўкі, засваеннем яго ў дзейнасці, з'яўляецца найважнейшым сродкам далейшага развіцця і самаразвіцця асобы. Менавіта такое навучанне з'яўляецца асновай інавацыйнай сістэмы падрыхтоўкі выпускнікоў, якія валодаюць неабходным аб'ёмам ведаў і навыкамі самастойнага вырашэння разнастайных прафесійных задач.

1. *Жук, О. Л.* Направления модернизации высшего образования и требования к педагогическим компетенциям преподавателей в контексте Болонского процесса / О. Л. Жук // Вышэйшая школа. – 2015. – № 5. – С. 18-22.

2. *Хащенко, Т. Г.* Интерактивные методы обучения в образовательном процессе вуза / Т. Г. Хащенко, Е. В. Макарова. – Ульяновск : УГСХА, 2011.– 46 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Панфилова, А. П.* Игровое моделирование в деятельности педагога : учеб. пособие для студ. вузов / А. П. Панфилова ; под общ. ред. В. А. Сластенина, И. А. Колесниковой. – Москва : Изд. центр «Академия», 2006. – 368 с.

***Борисова Ольга Олеговна***

## Современная система непрерывного библиотечно-информационного образования в России (опыт Орловского государственного института культуры)

Представлена система непрерывного библиотечно-информационного образования в России на примере Орловского государственного института культуры, приведена ее нормативно-правовая основа. Проанализированы результаты исследования документного потока по проблеме дополнительного профессионального образования библиотекарей.

*Ключевые слова:* непрерывное библиотечно-информационное образование; уровни профессионального образования; дополнительное профессиональное образование библиотекарей; стандартизация в образовательном процессе.

***Olga O. Borisova***

## Modern System of Continuous Library and Information Education in Russia (Experience of Orel State Institute of Culture)

The system of continuous library and information education in Russia on the example of the Orel state Institute of culture is presented, its legal basis is given. The results of the study of the document flow on the problem of additional professional education of librarians are analyzed.

*Keywords:* continuous library and information education; levels of professional education; additional professional education of librarians; standardization in the educational process.

Осознание современниками того, что гарантией прогресса общества является непрерывное образование граждан, подтверждается рядом документов российского и мирового масштаба, Это, прежде всего, Меморандум непрерывного образования Европейского союза (2000 г., Лиссабон), в котором оно образно определяется как «ученье длиною в жизнь» [1]; а также Федеральная целевая программа развития образования на 2016–2020 годы, утвержденная распоряжением Правительства Российской Федерации от 29 декабря 2014 г. № 2765-р [2].

В соответствии с Федеральным законом «Об образовании в Российской Федерации» в стране установлены следующие уровни профессионального образования 1) среднее профессиональное образование; 2) высшее образование – бакалавриат; 3) высшее образование – специалитет, магистратура; 4) высшее образование – подготовка кадров высшей квалификации [3].

В Орловском регионе исторически сложилась система непрерывного библиотечно-информационного образования, соответствующая данному закону (следует отметить, что она есть далеко не во всех регионах). Эта система представлена следующими уровнями и, соответственно, образовательными учреждениями: 1) Орловский областной колледж культуры и искусств (библиотечное отделение) – средний уровень; 2) Орловский государственный институт культуры, факультет документных коммуникаций (бакалавриат) – высший уровень; 3) Орловский государственный институт культуры, отдел аспирантуры и магистратуры – высший уровень (магистратура); 4) Орловский государственный институт культуры, отдел аспирантуры и магистратуры, подготовка научно-педагогических кадров (аспирантура); 5) Орловский государственный институт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ